**Яўсеенка Ірына Віктараўна**, настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” дзяржаўнай установы адукацыі «Рэчыцкі раённы ліцэй»

# МАЙСТАР-КЛАС
## «Навагодні тэкстапад: тэкст як асноўны інструмент фарміравання функцыянальнай адукаванасці»

**Мэта:** павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў праз выкарыстанне тэкстаў.

**Задачы:**

абгрунтаваць мэтазгоднасць выкарыстання тэкстаў для фарміравання функцыянальнай адукаванасці;

арганізаваць практычныя заняткі па рабоце з суцэльным, несуцэльным і камбінаваным тэкстам;

стварыць умовы для самарэалізацыі ўдзельнікаў майстар-класа і раскрыцця іх творчага патэнцыялу.

**Ход майстар-класа**

**І.Арганізацыйны этап**

**Майстар.** Добры дзень, шаноўныя калегі! Рада вітаць усіх, хто сёння завітаў на фестываль у пошуках ідэй, прыёмаў і сродкаў навучання.

**Прыём “За і супраць”.**

Звярніце ўвагу на цытаты, якія ляжаць перад вамі. Выберыце тую , якая найбольш адпавядае тэме сённяшняга майстар-класа і прывядзіце аргументы на карысць свайго выбару.

**ІІ.Матывацыйна-мэтавы этап.**

**Майстар.** Шмат гадоў назад босы хлапчук сядзеў на сцяне ў Рыме і глядзеў уніз на чалавека, які высякаў штосьці разцом з глыбы мармуру. “Гэй, сеньёр! – крыкнуў хлопчык гэтаму чалавеку. – Навошта Вы стукаеце па гэтым камені?”

Мікелянджэла паглядзеў уверх і крыкнуў у адказ: “Таму што там унутры анёл, і ён хоча выбрацца наверх”.

Кожны з нас,шаноўныя калегі, у сваёй рабоце з’яўляецца Мікелянджэла. Мы таксама хочам запаліць у дзіцячых вочках жаданне вучыцца.

**Прыём “Самамэтавызначэнне”.**

На дошцы прымацаваны дзеясловы мэтавызначэння: *даведацца, успомніць, асправаваць, разабрацца, прымяніць, апрабіраваць, успомніць.* Зыходзячы з тэмы майстар-класа і асабістай цікавасці да яе, на працягу адной хвіліны выберыце два дзеясловы,запішыце з імі сказы на стыкерах.

*Удзельнікі майстар-класа чытаюць свае варыянты, майстар фіксуе стыкеры на дошцы.*

**Прыём “Формула поспеху”**

У Вас на сталах знаходзяцца раздаткі. Выберыце, калі ласка, чатыры сняжынкі , якія неабходны для работы вашай групы на сённяшнім майстар-класе. (Талерантнасць, крэатыў, працаздольнасць, жаданне, добразычлівасць, адаптыўнасць).

Удзельнікі майстар-класа выбіраюць сняжынкі і прымацоўваюць іх на дошку.

**III. Інфармацыйны этап**.

**Майстар.** Да асноўных задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў сярэднетэрміновай перспектыве і на перыяд да 2030 года аднесена павышэнне якасці адукацыі, што абумоўлена патрэбай грамадства ў адукаваных, маральных, прадпрымальных і кампетэнтных асобах, здольных самастойна прымаць адказныя рашэнні ў сітуацыі выбару, прагназуючы іх магчымыя наступствы, якія ўмеюць выбіраць спосабы супрацоўніцтва. Яны павінны адрозніваццa мабільнасцю, дынамізмам, канструктыўнасцю, валодаць развітым пачуццём адказнасці за свой лёс і лёс краіны. Асноватворным навыкам для паспяховай сацыялізацыі і адаптацыі асобы ў свеце, які хутка змяняецца, становіцца **функцыянальная адукаванасць.**

-Што падразумеваецца пад паняццем **функцыянальная адукаванасць?**

Майстар прапаноўвае ўдзельнікам майстар-класа выбраць з прапанаваных снегавікоў той, на якім дадзена правільнае азначэнне функцыянальнай адукаванасці. ***Групы робяць выбар*** **.**

Майстар прапаноўвае прагляд мультфільма “У краіне нявывучаных урокаў”.

- Чаго не ведаў хлопчык? Якія адукаванасці ў яго адсутнічаюць?

**(прыродазнаўчая, матэматычная,чытацкая, крэатыўнае мысленне )**

Майстар робіць высновы пра складнікі функцыянальнай адукаванасці і прымацоўвае на дошку:

**чытацкая адукаванасць;**
**прыродазнаўчая адукаванасць;**
**матэматычная адукаванасць;**
**фінансавая адукаванасць;**
**крэатыўнае мысленне.**

**IV.Аперацыйна-пазнавальны этап.**

**Майстар**. Вось сёння мы пагаворым пра функцыянальную адукаванасць і што мы можам зрабіць, каб такіх навучэнцаў было як мага менш. Як нам можа дапамагчы ў гэтым тэкст?

Так, асноўны інструмент фарміравання функцыянальнай адукаванасці, безумоўна, **тэкст**. І ў нас будзе **навагодні тэкстапад.** Сёння мы папрацуем з суцэльным тэкстам, несуцэльным тэкстам і камбінаваным.

**V.Практычны этап.**

Майстар прапаноўвае ўдзельнікам майстар-класа пазнаёміцца з тэкстам “Дзе жыве сімвал Новага года?” і запоўніць табліцу, карыстаючыся інфармацыяй з тэксту.

**Дзе жыве сімвал Новага года?**

Дзед Мароз – гэта персанаж, які ўжо шмат дзясяткаў гадоў з'яўляецца сімвалам Новага года. Яго ведаюць і любяць усе жыхары Зямлі.

У кожнай краіне ёсць свой зімовы персанаж, толькі імёны розныя. У Амерыцы і Англіі яго называюць Санта-Клаусам. У Лапландыі жыве фінскі Ёулупукі, у Францыі і Іспаніі яго клічуць Пэр Ноэль, а Мікулаша чакаюць у Чэхіі. У Швецыі два персанажы, якіх завуць дзед Юлтамтэн і Юлнісар. Кіпрскага персанажа завуць Васілём. А вось у Італіі замест дзеда ёсць бабулька Бефана.

Беларускі Дзед Мароз жыве ў Белавежскай пушчы. Маёнтак займае амаль 15 гектараў Гэта адно з самых прыгожых месцаў «пражывання» Дзеда Мароза, якіх цяпер нямала ў свеце.

Рэзідэнцыя Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы адкрылася ў снежні 2003 года. Маляўнічая прырода, казачная атмасфера і ўнікальныя асаблівасці зрабілі яе адной з самых папулярных мясцін Беларусі.

Сядзіба размешчана ў старадаўнім запаведным лесе Еўропы, дзе захоўваецца адна з самых вялікіх папуляцый зуброў – буйнога прадстаўніка еўрапейскай фаўны. Тут жа расла самая высокая жывая навагодняя ёлка ў свеце, узрост якой – 150 гадоў. На жаль, летам 2014 елка пачала засыхаць і яе спілавалі, аднак у пушчы расце яшчэ нямала лясных прыгажунь, гісторыя якіх налічвае не менш за два стагоддзі.

Сёння «Маёнтак беларускага Дзеда Мароза» – самы вядомы турыстычны брэнд краіны , які штогод наведвае каля 150 тысяч чалавек.

**P.S**. Калі няма магчымасці наведаць пералічаныя мясціны напярэдадні Новага года, то вас чакаюць навагоднія інсталяцыі на Кастрычніцкай плошчы, ля Нацыянальнай бібліятэкі, Dana mall (станцыя метро “Усход”), Палаца спорту (станцыя метро “Няміга”), Лядовага палаца (вул. Прытыцкага).

1. Якое выказванне не адпавядае інфармацыі тэксту:

- ☐ Дзед Мароз ёсць ва ўсіх краінах.
- ☐ Белавежская пушча – адно з самых прыгожых месцаў “пражывання”Дзеда Мароза.
- ☐ Рэзідэнцыя Дзеда Мароза адкрылася ў 2005 годзе.
- ☐ Маёнтак беларускага Дзеда Мароза займае 15 гектараў.
- ☐ У Італіі замест традыцыйнага Дзеда Мароза ёсць бабулька Стэфана.
- ☐ “Маёнтак беларускага Дзеда Мароза” – самы вядомы турыстычны брэнд краіны.
- ☐ Сядзіба размешчана ў маляўнічым лесе Еўропы.

2. Групы выконваюць заданні, абапіраючыся на тэкст, абараняюць свае работы і вешаюць шары на навагоднюю ялінку, выбіраючы тую адукаванасць, якую высвятляла заданне.

<u>1 група.</u>

-Колькі часу існуе рэзідэнцыя Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы? (**матэматычная**)

-Колькі турыстаў прыняла рэзідэнцыя Дзеда Мароза? (**матэматычная**)

2 група.
-У якіх краінах размешчана пушча? **(прыродазнаўчая)**
-Які буйны прадстаўнік еўрапейскай фаўны захоўваецца ў старадаўнім запаведным лесе ?
3 група.
-Выберыце самы эканомны тур у Белавежскую пушчу. Абгрунтуйце чаму**.**
**(фінансавая)**
4 група
-Чаму засохла ялінка?
-Унясіце свае прапановы па захаванні дрэў у старадаўнім запаведным лесе.
**(глабальныя кампетэнцыі)**

**Экскурсія да Дзеда Мароза (Белавежская пушча)**
(прыклады праграм)
**Маршрут:** Мінск → Камянец → Камянюкі Белавежская пушча → Мінск
**Працягласць:** 750 км
**Працягласць:** 15:00 г.
**Тэматыка экскурсій:** Экалагічныя, Новы год і Каляды, Для школьнікаў, Анімацыя
**Від:** Аўтобусна-пешая
**Мова правядзення:** беларуская

Экскурсія ў Белавежскую пушчу пазнаёміць з найстарэйшым запаведным лесам Еўропы, занесеным у спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Сюды з'язджаюцца турысты з усяго свету, каб удыхнуць паветра векавога лесу, убачыць велічных зуброў і іншых жывёл – не толькі ў вальерах, але і ў лесе, падчас прагулкі па запаведнай сцежцы. А падарожжа ў Маёнтак Дзеда Мароза перанясе Вас у атмасферу казкі і чараўніцтва. Рэзідэнцыя Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы – абавязковая да наведвання ў перыяд навагодніх канікул.
**Праграма экскурсі – Да Дзеда Мароза (Белавежская пушча)**

**Сустрэча групы**

**Пераезд** у **Камянец** (350 км)

**Камянецкая (Белая) вежа** (вонкавы агляд)
**Камянецкая вежа**, **Белая Вежа** – па-рознаму называюць яе. Але сутнасць застаецца нязменнай – гэта найбольш захаваная і самая высокая вежа валынскага тыпу – сведка падзей 8 стагоддзяў. Яна бачыла кровапралітныя бітвы, аблогі рыцарамі-крыжакамі, штурм войскаў польскага князя Мазавецкага і літоўскіх князёў **Вітоўта** і **Ягайла**, разлютаваныя баі паміж войскамі Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы. Магчыма, яна і не з'яўляецца самым прыгожым архітэктурным збудаваннем, але гэта "5 ярусаў гісторыі", якія **Белая Вежа** захавала для нас.

**Пераезд** у **Камянюкі Белавежская пушча** (21 км)

**Дэманстрацыйныя вальеры з дзікімі жывёламі**
**Дэманстрацыйныя вальеры** змесцаваны паблізу Музея прыроды **Белавежскай пушчы**. На пляцы каля 20 га Вы ўбачыце асноўныя выгляды жывёл, якія насяляюць у **Белавежскай пушчы**. Тут блізка можна ўбачыць і лясных жыхароў, пачаставаць кавалачкам хлеба, яблыкам ці галінкай звыкнутых да наведнікаў зуброў, ласёў, кабаноў ці мядзведзя.

**Абед**

**Маёнтак Беларускага Дзеда Мароза**
Экскурсія ў **Маёнтак беларускага Дзеда Мароза** паклала пачатак фарміраванню новай традыцыі сустрэчы навагодніх свят для дзяцей і дарослых. Гэта сапраўды чароўнае месца прыцягвае да сябе не толькі школьнікаў, але і людзей больш старэйшых узростаў. Ужо каля самага ўваходу Вы трапляеце зусім у іншы свет, забываючыся пра паўсядзённую мітусню, цалкам апускаецеся ў казку. **Дом Дзеда Мароза** з майстэрнямі, домік **Снягуркі**, музей дзіцячых лістоў, дзе захоўваюцца лісты, малюнкі і вырабы, якія дасылаюць дзеці з усёй краіны, вятрак, чароўная студня і два рыцары на ўваходзе: Дуб-Дубовіч і Вяз-Вязовіч. Кожны наведвальнік атрымае навагодні падарунак ад самога **Дзеда Мароза** і **Снягуркі**.

**Пераезд** у **Мінск** (370 км)

Заканчэнне экскурсіі

**К Деду Морозу в Беловежскую пущу**

*Стоимость:* 🏷 ***от 130руб.***

*Маршрут:* ***Минск ➡Беловежская пуща***

*Даты выезда:* ***27.12, 29.12, 04.01***

*Длительность:* ***1 день***

*Транспорт:* ***Автобус*** 🚍

*Что посетите:* ***Резиденцию Деда Мороза, Вольеры, музей природы***

*Включено в стоимость:* ***Проезд, экскурсии***

*Особенности:* ***яркие эмоции в предвкушении Нового Года***

*Скидки при записи группы от 5 человек.*

**Экскурсия к деду Морозу принесет вам: море положительных эмоций!**

**06:30**

Отправление из Минска.

12:30

Приключения начинаются! Прибытие в Беловежскую пущу. Знакомство с Беловежской пущей включает в себя множество удивительных событий: Сначала мы посещаем музей природы, где узнаем об обитателях флоры и фауны Беларуси в разные исторические эпохи.

Прогулка по вольерам с животными, где вживую можно увидеть символ Беларуси – великого зубра. Осмотр вольеров с животными.

Посещение резиденции Деда Мороза. Вы окунетесь в новогоднюю сказку и сможете увидеть:

- поместье Деда Мороза;
- домик Снегурочки;
- музей Деда Мороза;
- ветряную мельницу;
- волшебный колодец;
- скульптурные композиции из дерева « 12 месяцев»;
- «Белоснежка и семь гномов» и многое другое.

Множество огоньков, резные скульптуры и уникальная сказочная архитектура поместья погрузят в детский восторг даже взрослое поколение. Настенька разведет костер около 12 месяцев, волшебная мельница перемелет печаль и скуку. Затем, мы с Вами увидим на территории резиденции самую высокую в Европе сорокаметровую 120-летнюю натуральную ель в своем новогоднем убранстве. Возле этой ели Вас встретит Матушка-Зима и закружит в новогоднем хороводе.

Каждый получает от Деда Мороза подарок!

С Новым 2025 Годом, Друзья!

Исполнения желаний и масса положительных эмоций!!!

16:30

Обед в кафе

17:30

Выезд в Минск

23:00 Ориентировочное прибытие в Минск

3. Майстар прапаноўвае ўдзельнікам майстар-класа самастойна скласці заданне для фарміравання функцыянальнай адукаванасці, абапіраючыся на несуцэльны тэкст (карта Беларусі і схему Мінскага метрапалітэна).

*Групы прэзентуюць свае работы і вешаюць навагоднія шары на ялінку.*

**4.** Удзельнікам майстар-класа прапаноўваюцца навагоднія буклеты з розых гандлёвых кропак**.** Неабходна папрацаваць з тэкстамі буклетаў,ператварыць несуцэльны тэкст у суцэльны і адказаць на пытанні**.**

У якой краме самыя танныя прадукты і якія?

Збярыце прадукты на навагодні стол на сям'ю з 2-х чалавек на 100 руб.

Размяркуйце прадукты на дзве групы:

карысныя прадукты харчавання;

прадукты, якія б вы не раілі набыць. Чаму?

**5. Прыём “Кошык ідэй”**

Майстар прапаноўвае ўдзельнікам майстар-класа разам запоўніць кошык ідэямі па рабоце з тэкстам як асноўным інструментам па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці.

*Удзельнікі зачытваюць свае ідэі і збіраюць іх у кошык, які перадаецца па ланцужку.*

**6.Рэфлексія і падвядзенне вынікаў.**

**Прыём “Збяры тэкст”**

Удзельнікі майстар-класа атрымліваюць раскіданыя словы, з якіх неабходна скласці тэкст.

1 група

жыла ў лесе елачка,
У лесе і расла,
Узімку, улетку стройная,
Зялёная была.
Мяцеліца ёй песеньку
Пяяла: баю-бай,
Мароз сняжком атуліваў:
Глядзі, не замярзай!
Пужлівы зайчык шэранькі
Пад елачкай скакаў,

2 група

Падчас і воўк,
сярдзіты воўк,
Ускоч перабягаў.
Вось снег у лесе
дрэмлючым
Пад полаззем
скрыпіць,
І конік жвавы, сівенькі
Спяшаецца, бяжыць.
Вязе той конік саначкі,
А ў санках селянін,

3 група

Пад'ехаў
ён пад елачку
І ссек у міг адзін.
Цяпер яна прыбраная
На свята к нам прыйшла
І шмат пацехі, радасці

Шэранькі зайчык пужлівы
Скакаў пад елачкай,
І воўк падчас,
Воўк сярдзіты,

Ускоч перабягаў.

4 група

У лесе узышла елачка,
І расла ў лесе.
Стройная ўлетку ,
Узімку была зялёная.
Песеньку ёй мяцеліца
Баю-бай, пяяла:
Атуліваў: сняжком мароз
Не замярзай! Глядзі!

*Групы абараняюцца і разам співаюць песню” У лесе нарадзілася , у лесе і расла”.*

*Майстар прапануе ўдзельнікам майстар-класа выбраць з прапанаваных мандарынак тыя, якія адпавядаюць чаканням ад майстар-класа і пакласці іх пад ялінку.*

**Майстар**. Шаноўныя калегі! Закончыць нашу сустрэчу мне б хацелася словамі Дэна Мільштэйна:

“Заўсёды стаў перад сабой задачу дабрацца да месяца. Нават калі ты прамахнешся, то апынішся сярод зор”.